**10 клас**
**Комплексная работа**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Выпішыце словы, правапіс якіх не адпавядае сучасным нормам. Запішыце адпаведнае правіла. Хто аўтар гэтага твора?**

*Максімальная колькасць балаў — 5*

| Назва правіла | Прыклады слоў з тэксту |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |

**Аўтар твора:________________________**

Трыолет
Мне доўгае разстаньне з Вамі
Чэрней ад Вашых чорных кос.
Чаму ж нядобры час прынёс
Мне доўгае разстаньне з Вамі.
Я паблядънеў ад горкіх сьлёз
І трыолет пачаў славамі:
Мне доўгае разстаньне з Вамі
Чэрней ад Вашых чорных кос.

**Заданне 2. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Лічэбнікі запішыце словамі.**

*Максімальная колькасць балаў — 6*

По размерам территории Республика Беларусь занимает тринадцатое место среди европейских государств. В Европе Беларусь по площади немного уступает Великобритании и Румынии и более чем в два раза превосходит Португалию и Венгрию. Общая ее площадь — 207,6 тыс. км$^2$. Наибольшая протяженность с запада на восток — 650 км, с севера на юг — 560 км.

________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________

**Заданне 3. У табліцы прадстаўлены тыпы суфіксальнага словаўтварэння назоўнікаў агульнага роду. У пустыя клеткі ўпішыце прапушчаныя суфіксы або словы.**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

| № | Суфікс | Слова |
|---|---|---|
| 1. | | *папрашайка* |

| | | |
|---|---|---|
| 2. | -ак-(а) / -як-(а) | |
| 3. | | *бадзяга, туляга* |
| 4. | -к-(а) | |
| 5. | | *запявала* |
| 6. | -он-(я) | |
| 7. | | *злюка* |
| 8. | -ейк-(а) | |

**Заданне 4. Устаўце прапушчаныя літары і да кожнай лексемы падбярыце такія словы, якія рыфмуюцца. Запішыце парамі і пастаўце націскі.**

*Максімальная колькасць балаў – 9*

***Узор: раку́шка — маку́шка.***

Зав...дскі —
ц...мент —
к...ршун —
ім...нны —
кр...вавы —
камбайн...р —

**Заданне 5. Падбярыце да імён, якія выкарыстоўваюцца ў гутарковым стылі, і запішыце афіцыйна зацверджаныя адпаведнікі**

*Максімальная колькасць балаў – 3*

Гэля —
Зося —
Стэфа —
Галляш —
Саўка —
Тамаш —

**Заданне 6. Запішыце словы ў адпаведныя пустыя клеткі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Аплікант, аршын, гарнец, гута, жаўнер, жупан, лапсярдак, палаш, пастарунак, паядынька.

| ***Тэматычныя групы*** | ***Словы*** |
|---|---|
| Назвы асоб па пасадзе і роду заняткаў | |
| Назвы ўстаноў і прамысловых прадпрыемстваў | |
| Назвы прадметаў адзення | |
| Назвы зброі | |
| Назвы адзінак вымярэння | |

**Заданне 7. Сёння ў беларускую мову прыйшло шмат запазычанняў, якія можна замяніць ужо існуючымі ў мове адпаведнікамі. Да кожнага з прапанаваных слоў запішыце такі адпаведнік — слова ці словазлучэнне.**

*Максімальная колькасць балаў — 5*

Байкер -
банкінг-
блокбастар -
электарат-

камедзі клаб -
мерчандайзер -
прайм-тайм -
супер! -
ток-шоу -
хіт-

**Заданне 8. Назавіце сродкі мастацкага адлюстравання і мастацкай выразнасці ў прапанаваным тэксце.**

*Максімальная колькасць балаў — 5*

Вылеці, сізая галачка,
Вынесі залатыя ключы,
Замкні халодную зімачку,
Адамкні цёплае лецечка.

| *Сродкі мастацкага адлюстравання і мастацкай выразнасці* | *Прыклады з тэксту* |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 9. Францыск Скарына з'яўляецца аўтарам:**

*Максімальная колькасць балаў — 3*

1) 23 кніг Бібліі;
2) прадмоў да кніг Бібліі;
3) перакладаў кніг Бібліі;
4) "Катэхізіса";
5) "Малой падарожнай кніжыцы";
6) Статута Вялікага Княства Літоўскага.

**Заданне 10. Запоўніце табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў — 5*

| **Назва твора** | **Жанр** | **Аўтар (прозвішча ці псеўданім)** |
|---|---|---|
| "Нарач" | | Максім Танк |
| "Верасень" | верш | |
| "Датрымаў характар" | | Алесь Гарун |
| "Нямоглы бацька" | | Уладзімір Караткевіч |
| "Страта" | апавяданне | |
| "Маёвая песня" | верш | |
| "Сірочы хлеб" | | Янка Брыль |
| "Бывай" | верш | |
| "Песня пра зубра" | паэма | |
| "Гражына" | паэма | |

**10 клас**
**Комплексная работа**
**ДАВЕДКІ**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **5** | **6** | **4** | **9** | **3** | **5** | **5** | **5** | **3** | **5** | **50** |

**Заданне 1.**
***Каментарый. За 1 лічэбнік (пераклад, правапіс) – 0,5 бала, плюс 2 балы – за астатні пераклад.***

| *Назва правіла (па 0,5 бала)* | *Прыклад слоў з тэксту (па 0,5 бала)* |
|---|---|
| 1. правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах | трыолет |
| 2. правапіс літар з/с у прыстаўках | разстаньне |
| 3. правапіс мяккага знака | разстаньне, сьлёз |
| 4. аканне (правапіс о,э,а) | чэрней |

**Аўтар твора**: *Максім Багдановіч **(1 бал)***

**Заданне 2.**

Па памерах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь займае трынаццатае месца сярод еўрапейскіх дзяржаў. У Еўропе Беларусь па плошчы крыху саступае Вялікабрытаніі і Румыніі і больш чым у два разы пераўзыходзіць Партугалію і Венгрыю. Агульная плошча – **дзвесце сем цэлых шэсць дзясятых** тыс. км$^2$. Найбольшая працягласць з захаду на ўсход — **шэсцьсот пяцьдзясят** км, з поўначы на поўдзень — **пяцьсот шэсцьдзясят** км.

**Заданне 3.** ***Каментарый. У вучняў – свае прыклады.***

| **№** | **Суфікс** | **Слова (прыклад)** |
|---|---|---|
| 1. | -айк-(а) | папрашайка |
| 2. | -ак-(а) / -як-(а) | служака, здаравяка |
| 3. | -яг-(а) | бадзяга, туляга |
| 4. | -к-(а) | выскачка |
| 5. | -л-(а) | запявала |
| 6. | -он-(я) | ціхоня |
| 7. | -ук-(а) / -юк-(а) | злюка |
| 8. | -ейк-(а) | госцейка |

**Заданне 4.**

***Каментарый. Па 0,5 бала– за кожную ўстаўленую літару; па 0,5 бала– за кожнае парнае слова, па 0,5 бала – за кожны націск. (у вучняў – свае варыянты слоў)***

Зав**о**дскі — флоцкі
ц**э**мент — дацэнт
к**а**ршун — пярун
ім**е**нны (ім**я**нны) — дрэнны
кр**ы**вавы — дзяржава
камбайн**е**р — лайнер

**Заданне 5.**

Гэля — Алена
Зося — Соф’я (Сафія)
Стэфа — Стэфанія
Галляш — Ілья
Саўка — Савелій
Тамаш – Фама

**Заданне 6.**

| *Тэматычныя групы* | *Словы* | |
|---|---|---|
| Назвы асоб па пасадзе і роду заняткаў | *аплікант* | *жаўнер* |
| Назвы установ і прамысловых прадпрыемстваў | *гута* | *пастарунак* |
| Назвы прадметаў адзення | *жупан* | *лапсярдак* |

| | | |
|---|---|---|
| Назвы зброі | *палаш* | *паядынька* |
| Назвы адзінак вымярэння | *аршын* | *гарнец* |

***Каментарый.*** *Аплікант – 'вучань пры адвакаце ці землямеры'; аршын – 'мера даўжыні'; гарнец – 'мера сыпкіх і вадкіх цел'; гута – 'шклозавод'; жаўнер – 'салдат'; жупан – 'доўгі суконны кафтан'; лапсярдак – 'кафтан'; палаш – 'сабелька'; пастарунак – 'аддзяленне паліцыі ў Заходняй Беларусі'; паядынька – 'аднаствольная паляўнічая стрэльба'.*

**Заданне 7.**

Байкер — *матацыкліст, веласіпедыст*; банкінг — *банкаўскае абслугоўванне*; блокбастар — *касавы фільм*; электарат — *выбаршчыкі*; камедзі клаб — *камедыйны клуб (клуб камедыі)*; мерчандайзер — *гандлёвы прадстаўнік, адказны за выкладку тавару*; прайм-тайм — *найвыгаднейшы час* (у эфіры); супер! — *найвышэйшы клас*! *(здорава);* ток-шоу — *размоўная праграма*; хіт — *штосьці вельмі папулярнае.*

**Заданне 8.**

| ***Сродкі мастацкага адлюстравання і мастацкай выразнасці*** | ***Прыклады з тэксту)*** |
|---|---|
| традыцыйныя фальклорныя эпітэты | ***сізая*** *галачка,* ***залатыя*** *ключы,* ***халодную*** *зімачку,* ***цёплае*** *лецечка* |
| паэтычны зваротак | *сізая галачка* |
| памяншальна-ласкальная форма слоў | *зімачку, лецечка* |
| паэтычны вобраз-сімвал | «Сізая галачка», якая «залатымі ключамі» замыкае «халодную зімачку» і адмыкае «цёплае лецечка», – гэта паэтычны вобраз-сімвал, традыцыйны народнапесенны «знак» надыходу вясны. |
| метафары | *Замкнуць,* як хату або клець, *зіму* і *адамкнуць лета* – значыць утварыць дзеянні яўна метафарычныя (дзеясловам тут нададзены пераносны сэнс) |

**Заданне 9. 2, 3, 5.**

**Заданне 10.** ***Каментарый. (0,5 бала за кожны правільна запоўнены радок)***

| **Назва твора** | **Жанр** | **Аўтар (прозвішча ці псеўданім)** |
|---|---|---|
| "Нарач" | **паэма** | Максім Танк |
| "Верасень" | верш | **Анатоль Грачанікаў** |
| "Датрымаў характар" | **п'еса** | Алесь Гарун |
| "Нямоглы бацька" | **казка** | Уладзімір Караткевіч |
| "Страта" | апавяданне | **Генрых Далідовіч** |
| "Маёвая песня" | верш | **Максім Багдановіч** |
| "Сірочы хлеб" | **аповесць** | Янка Брыль |
| "Бывай" | верш | **Аркадзь Куляшоў** |
| "Песня пра зубра" | паэма | **Мікола Гусоўскі** |
| "Гражына" | паэма | **Адам Міцкевіч** |